**УДК 947.6 “1944/1955”**

# АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА КУЛЬТУРНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ

***Н.К. ЮРГЕВІЧ***
***(Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны)***

*Аналізуецца аднаўленне і развіццё сельскіх агульнаадукацыйных школ, праблема вырашэння педагагічных кадраў, выкананне закона аб усеагульным навучанні дзяцей, ліквідацыя нягgraматнасці сярод дарослага насельніцтва, роля школы ў выхаванні маладога пакалення ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. На аснове архіўных дадзеных абазначаны праблемы, якія стрымлівалі аднаўленчыя працэсы ў беларускай вёсцы.*

Важнейшым накірункам культурнага будаўніцтва ў пасляваеннай беларускай вёсцы з’яўлялася аднаўленне агульнаадукацыйнай школы, ліквідацыя атрыманых страт у вобласці народнай адукацыі. За гады Вялікай Айчыннай вайны беларуская рэспубліка страціла 6808 школьных будынкаў, многія сельскія агульнаадукацыйныя школы былі разбураны і разрабаваны. Асабліва цяжкае становішча было ва ўсходніх раёнах БССР, дзе ворагі знішчылі і разбурылі 4347 школ. У Бягомльскім і Плешчаніцкім раёнах Мінскай, Лельчыцкім і Капаткевіцкім Палескай, Суражскім і Лёзненскім Віцебскай абласцей і ў многіх іншых месцах Беларусі ворагі знішчылі ў сельскай мясцовасці ўсе набыткі даваеннага будаўніцтва [1, ар. 184].

Аднаўленчыя работы ў вёсцы пачаліся адразу пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па стану на 15 лістапада 1943 года заняткі вяліся ў 259 школах вызваленых раёнаў Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Палескай абласцей [2, ар. 5]. У адпаведнасці з Пастановай ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б)Б у вобласці масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва» ад 9 жніўня 1944 года Саўнаркам БССР і ЦК КП(б)Б абавязваліся аднавіць да пачатку 1944/45 навучальнага года сетку пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ і ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту [3, с. 506 – 512].

Нягледзячы на вялікія эканамічныя цяжкасці, выдзяленне сродкаў на адукацыю павялічвалася з кожным годам. Аднак будаўніцтва сельскіх школ ішло вельмі марудна: не хапала рабочай сілы, транспарту, будаўнічых матэрыялаў. Нават у маі 1946 года ў Полацкай і Віцебскай абласцях 51 сельская школа працавала ў зямлянках [4, ар. 12]. Аналіз архіўных дакументаў сведчыць, што планы капітальнага будаўніцтва школьных аб’ектаў не выконваліся і ў больш познія гады. Напрыклад, з васьмі аб’ектаў у Віцебскай вобласці да пачатку 1948/49 навучальнага года былі здадзены ў эксплуатацыю толькі тры – адна сельская і дзве гарадскія школы: Янавіцкая СШ, СШ № 1 г. Віцебска, СШ № 6 г. Оршы [5, ар. 264]. Па гэтай прычыне у некаторых вясковых школах у адным пакоі займалася некалькі класаў, заняткі праводзіліся ў дзве, а то і тры змены. Адзначым, што большасць арандаваных памяшканняў не адпавядала элементарным патрабаванням гігіены. Такжа павольна вырашалася праблема прышкольных інтэрнатаў: вясковыя дзеці з-за вялікай адлегласці часта прапускалі заняткі ці зусім не наведвалі іх. Напрыклад, у 1952 годзе план будаўніцтва прышкольных інтэрнатаў не быў выкананы ў Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай, Баранавіцкай абласцях [6, ар. 13].

Адметнай рысай культурнага аднаўлення ў беларускай вёсцы пасля вайны стала так званае ініцыятыўнае будаўніцтва – узвядзенне школьных будынкаў сіламі калгаснікаў, настаўнікаў, вучняў, іх бацькоў, аднавяскоўцаў. Напрыклад, у 1945/46 навучальным годзе калектыў Баеўскай пачатковай школы Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці сваімі сіламі аднавіў памяшканне школы; загадчыца Азерскай пачатковай школы Круглянскага раёна гэтай вобласці перадала шыбы з вокнаў сваёй кватэры для рамонта школы [7, ар. 5]. Такім спосабам з 1945 па 1951 г. у БССР было ўзведзена 3925 тыпавых школ, што дазволіла кіраўніцтву многіх раёнаў поўнасцю вывесці сельскія школы з наёмных памяшканняў [2, с. 82, ар. 101].

Паспяховаму вырашэнню будаўнічых работ садзейнічала сацыялістычнае спаборніцтва. Сведчанне таму – пастанова Калегіі Міністэрства адукацыі і прэзідыума ЦК прафсаюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ БССР ад 31 студзеня 1953 года «Аб выніках сацыялістычных спаборніцтваў па падрыхтоўцы да 1952/53 навучальнага года», якая адзначыла, што да 15 жніўня 1952 года поўнасцю закончылі падрыхтоўку да новага навучальнага года Івацэвіцкі, Ружанскі, Пружанскі, Бярозаўскі, Антопальскі ў Брэсцкай, Шаркаўшчынскі і Браслаўскі ў Полацкай, Хоцімскі, Касцюковіцкі і Слаўгарадскі раёны ў Магілёўскай абласцях [6, ар. 13].

Трэба адзначыць, што ў аднаўленчы перыяд вясковыя школы ў асноўным фінансаваліся сельскімі і пасялковымі Саветамі. Дадзеныя архіўных матэрыялаў дазваляюць зрабіць вывад, што мясцовае кіраўніцтва не заўсёды праяўляла належную ўвагу да школьнай справы. Напрыклад, пра бюракратызм і безадказнасць мясцовай улады сведчыў дырэктар Кнатоўшчынскай школы Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці: школа пералічыла лясгасу грошы, а лесаматэрыял па віне сельсавета так і не атрымала [8, ар. 21]. Па віне мясцовых органаў кіравання затрымлівалася выплата арэнднай платы насельніцтву за памяшканні, прыстасаваныя пад школы. Да прыкладу, запазычанасць ў 1946 годзе ў Багушэўскім і Лёзненскім раёнах Віцебскай вобласці была настолькі вялікай, што гаспадары будынкаў, у якіх размяшчаліся школы, вынеслі «увесь школьны інвентар на вуліцу» [5, с. 11, ар. 137]. Трэба адзначыць і такі факт: вясковыя школы зусім не фінансаваліся ў летні час, які быў найбольш спрыяльным для падрыхтоўкі іх да новага навучальнага года. Пры гэтым у канцы бюджэтнага года рэшткі грошай, якіх у райвыканкамах заставалася нямала, вельмі часта спісваліся ў бюджэт. Архіўныя дакументы сведчаць, што прыстасаваныя да часовага выкарыстання пасля вайны памяшканні сельскіх школ інвентаром і мэбляй у большасці выпадкаў не папаўняліся. Напрыклад, Прыпернянская сямігадовая школа Глыбоцкага раёна Маладзечанскай вобласці нават у 1955 годзе «имела всего один стол и один стул, остальное количество занималось у хозяина по месту аренды школьного помещения» [9, ар. 7]. Адзначым, што ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязвалі прамкамбінаты, прамарцелі нарыхтоўваць неабходную школам мэблю, інвентар. Аднак планы часта былі настолькі завышанымі, што арганізацыі не маглі іх выканаць. Сведчаннем таму была работа ў першым паўгоддзі 1945/46 навучальнага года Віцебскага Аблместпрома, які пры планавым заданні 1075 парт вырабіў толькі 508 [5, с. 11, ар. 37].

Аналіз дакументаў паказвае, што сапраўднае становішча сельскіх школ органамі ўлады дэталёва не вывучалася і не аналізавалася. Узяць, напрыклад, сітуацыю з ацяпленнем школ у асенне-зімовы перыяд. Як правіла, усе справаздачы сведчылі аб падрыхтаванасці школ да работы ў такіх умовах. Рэальнае становішча даволі часта было зусім іншым. Напрыклад, з наступленнем халадоў шмат у якіх вёсках дзеці неслі ў школу па палену дроў.

Дакументы сведчаць, што ў першыя пасляваенныя гады вясковыя школы БССР працавалі ў вельмі цяжкіх умовах. Замест падручнікаў настаўнікі і дзеці нярэдка выкарыстоўвалі газеты і часопісы, а замест крэйды і чарніла – вугаль і сажу. Настаўнікі самі рабілі вучэбныя дапаможнікі. Міністэрства асветы БССР у адпаведнасці з магчымасцямі імкнулася вырашыць пытанні, звязаныя з забеспячэннем школ падручнікамі і нагляднымі дапаможнікамі. Напрыклад, у ходзе падрыхтоўкі да 1945/46 навучальнага года школам рэспублікі на беларускай мове было выдзелена 2 385 000 экзэмпляраў падручнікаў розных назваў, 12 мільёнаў сшыткаў, алоўкі, пісьмовыя прылады. Праўда, як сведчыў загадчык Віцебскага абласнога аддзела народнай адукацыі, падручнікаў аказалася недастаткова, бо па вобласці не атрымалася нават па адной кнізе на аднаго вучня [5, с. 3, ар. 98]. Саўнаркам БССР 26 кастрычніка 1944 года выдаў Пастанову № 723 «Об извращениях в торговле тетрадями и школьно-письменными принадлежностями», у якой запатрабаваў спыніць незаконную перадачу сшыткаў армейскім, дзяржаўным і іншым арганізацыям, навесці улік, наладзіць кантроль за размеркаваннем сшыткаў і падручнікаў на месцах [5, с. 3, ар. 67]. Аднак гэта праблема заставалася нявырашанай і ў пазнейшыя гады.

Значную дапамогу настаўнікам і вучням маглі аказаць школьныя бібліятэкі. Аднак шмат якія аддзелы народнай адукацыі і загадчыкі школ не прымалі мер да іх укамплектавання і папаўнення. Вось сведчанне: па стану на 1 кастрычніка 1946 года толькі 7 школ Мінскай вобласці заключылі дагаворы з бібкалектарам, а школы Мінскага, Бярэзінскага, Бягомльскага, Плешчаніцкага і іншых раёнаў гэтай вобласці нават не ведалі пра такую магчымасць [10, ар. 375]. Часта пачатковыя і сямігадовыя сельскія школы не мелі на гэта сродкаў, а таму школьныя бібліятэкі папаўняліся літаратурай вельмі марудна, іх роля ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ў пачатку 50-х гадоў заставалася нязначнай. У шмат якіх школах адсутнічалі кінаапараты, радыёпрыёмнікі, рэпрадуктары, а 980 школ не мелі нават радыё [6, с. 12, ар. 6].

Адным з важнейшых атрыбутаў суверэнітэта любой дзяржавы з’яўляецца адкрыццё школ на мове асноўнай нацыі. У пасляваенныя гады ў БССР штогод расла колькасць школ на беларускай мове. Тытульныя спісы новых школ паказалі 4 – 5-кратную перавагу беларускамоўных школ над рускамоўнымі. Напрыклад, у 1945 годзе ў Брэсцкай вобласці меліся 634 школы, з іх былі 570 беларускамоўныя і толькі 36 рускамоўныя [1, с. 20, ар. 193].

Аднак навучанне на роднай мове ў першыя пасляваенныя гады замаруджвалася з-за непадрыхтаванасці настаўніцкіх кадраў і недахопу падручнікаў на беларускай мове. Сведчанне таму – пратакол паседжання сакратарыята ЦК КП(б)Б ад 9 красавіка 1944 года, у якім пры разглядзе пытання «Становішча беларускай мовы ў школах БССР», адзначана ў якасці галоўных недахопаў адначасовае двухмоўе настаўнікаў і недахоп падручнікаў беларускага выдання, выкладанне беларускай мовы ў пачатковых класах вясковых школ па рускаму буквару [1, с. 22, ар. 2]. Як адрэагавала Міністэрства асветы БССР на стан вывучэння беларускай мовы, сведчыць наступны факт: ад выпускных экзаменаў па беларускай мове і літаратуры вызваляліся як вучні 7 класа, якія ўпершыню прыехалі ў БССР, так і рээваку-

іраваныя з усходніх абласцей СССР, і вучні 10 класаў незалежна ад таго, дзе яны знаходзіліся ў час вайны. У пасведчанні або атэстаце супраць назвы беларуская мова і літаратура было прапанавана пісаць «не вывучана» [5, с. 8, ар. 139]. Аб пастаяннай увазе да гэтай праблемы сведчыць і тое, што да сярэдзіны 50-х гадоў XX стазоддзя ўсе вясковыя школы былі пераведзены на беларускамоўнае навучанне.

Некалькі слоў аб своеасаблівасці моўнай сітуацыі ў заходнебеларускай вёсцы. Моўная сітуацыя ўскладнялася тым, што, з аднаго боку, шмат вучняў 2 – 4-га класаў не ведалі нават рускага алфавіту, а з другога, у Гродзенскай, Баранавіцкай, Маладзечанскай, Вілейскай, Брэсцкай, Пінскай абласцях (тэрыторыі, якія былі далучаны 17 верасня 1939 г.) большасць вучняў не ведала рускага алфавіту, ды й беларускую мову ў сістэмным выглядзе вывучала ўпершыню [1, с. 34, ар. 414]. Тым больш што дзеючая Пастанова ЦК ВКП(б) і Саўнаркама СССР ад 13 сакавіка 1938 года абавязвала ў БССР рускую мову ў беларускіх школах і беларускую мову ў рускіх школах вывучаць у сельскіх пачатковых школах з 2-га класа [2, с. 10, ар. 28].

Як адзначаюць дакументы, у паўднёвых раёнах Брэсцкай, Гродзенскай і Пінскай абласцей украінцы дабіваліся адкрыцця ўкраінскіх школ, а палякі – польскіх. У гэтых абласцях пры перапісу дзяцей у графе «На якой мове жадаеш вучыцца?» многія запісалі сябе беларусамі, але жадалі вучыцца на польскай мове. Таму, сведчаць дакументы, у першы дзень заняткаў 1944/45 навучальнага года беларускамоўныя школы былі амаль пустымі, а польскамоўныя – перапоўненыя [1, с. 22, ар. 39]. Бацькі вучняў выказваліся, што польская мова дзецям патрэбна па рэлігійных матывах, і нават забаранялі наведваць савецкія школы.

На аснове дакументаў і матэрыялаў архіваў прыходзім да вываду: насельніцтва заходніх раёнаў БССР з неабходнасцю ўспрымала патрабаванне ведання рускай мовы, як мовы агульнасаюзнай, але беларускую мову разглядала як мову «вясковую» і непатрэбную для далейшага развіцця, як мову неадукаванага насельніцтва. Як адносіліся мясцовыя ўлады да аднаўлення і развіцця польскіх школ, добра бачна з выказвання аднаго з кіраўнікоў: цяжкасцей пры пераводзе польскіх школ на іншыя мовы навучання не было, бо «большасць вучняў не палякі, а беларусы, у быту карысталіся беларускай мовай лепш, чым польскай», а «палякамі яны лічылі сябе таму, што належылі да рымска-каталіцкай канфесіі» [2, с. 18, ар. 163]. Вось адзін з прыкладаў. Загад Гродзенскага АблАНа ад 28 чэрвеня 1946 года за № 103 патрабаваў ад усіх загадчыкаў рай(гар)ана перагледзець школьную сетку на 1946/47 навучальны год «в национальном разрезе, не допуская искусственного сокращения количества школ, ведущих преподавание на языках национальных меньшинств» [2, с. 18, ар. 6]. Праўда, пасля выхаду гэтага загаду становішча на Гродзеншчыне амаль што не змянілася – «дух» панскай Польшчы ўладарыў у польскамоўных школах яшчэ даволі працяглы час. Таму і невыпадковымі былі паведамленні ў Міністэрства адукацыі (напрыклад, з Маладзечанскай вобласці), што вясковыя школы слаба выхоўвалі ў вучняў патрыятызм, любоў да радзімы [2, с. 118, ар. 127].

Несумненна, у заходніх абласцях, дзе абсалютная большасць насельніцтва была веруючай, вельмі вялікім быў уплыў на сельскія школы прадстаўнікоў рэлігійнага культа. А паколькі матэрыяльная база сельскіх школ даволі доўгі час заставалася слабай, часта выхаваўчую функцыю бралі на сябе святары і манахі (напрыклад, у Здзітаўскай, Бярозаўскай, Раснянскай школах Брэсцкага і іншых раёнаў Брэсцкай вобласці). Захавалася сведчанне, што ў Свірскім раёне Маладзечанскай вобласці ў 1944/45 навучальным годзе пры касцёле існаваў фізкультурны гуртoк пад кіраўніцтвам манашкі [2, с. 118, ар. 127]. Кіраўніцтвам адукацыі, камітэтамі камсамола прымаліся пэўныя захады да актывізацыі дзейнасці камсамольскіх і піянерскіх арганізацый, развіцця пазакласнай і пазашкольнай работы з вучнямі, якая часцей за ўсё зводзілася да арганізацыі мастацкай самадзейнасці ў гонар рэвалюцыйных святаў [2, с. 22, ар. 12].

Аднаўленне абавязковага пачатковага навучання, развіццё сямігадовай і сярэдняй школы разам з умацаваннем навучальна-матэрыяльнай базы школьнай сеткі пасля вайны патрабавалі больш хуткіх тэмпаў падрыхтоўкі педагагічных кадраў для сельскай мясцовасці. Праблема з забеспячэннем вясковых школ педагагічнымі кадрамі ў разглядаемы перыяд была дастаткова вострай. Да прыкладу, у 1944/45 навучальным годзе былі запатрабаваны 35272 настаўнікі, аднак колькасць узятых на ўлік да 1 снежня 1944 года склала толькі 30822 чалавекі [2; ар. 167].

Дзяржавай былі прыняты меры па рээвакуацыі педагагічных кадраў з усходніх раёнаў Савецкага Саюза. На працу запрашаліся не толькі настаўнікі-франтавікі, але і ўсе тыя, хто жадаў і мог працаваць у школе. У адпаведнасці з Пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 5 мая 1942 года № 629 ад платы за навучанне ў вышэйшых навучальных установах вызваляліся асобы, якія вярнуліся з вайны па раненні, кантузіі, калецтве ці хваробе, незалежна ад часу [4, с. 52, ар. 47].

Вялікі недахоп у настаўніках асабліва адчуваўся ў заходніх абласцях. Саўнаркам СССР Пастановай ад 22 сакавіка 1945 года «О мерах помощи школам Западной Беларуси» прапанаваў рээвакуіраваць усіх настаўнікаў-беларусаў у распараджэнне Наркамасветы БССР для работы ў заходніх абласцях. Выконваючы гэтую пастанову, партыйныя і савецкія органы да кастрычніка 1945 года паслалі ў школы заходніх абласцей 4450 настаўнікаў. У заходнія раёны БССР настаўнікаў накіроўвалі таксама з

Мінскай, Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай і іншых абласцей. Да прыкладу, у 1945 годзе ўсходнія вобласці накіравалі для працы на захадзе рэспублікі 400 настаўнікаў 1 – 4 класаў [5, с. 7, ар. 86]. Праўда, такія рашэнні дакладна не выконваліся, бо ва ўсходніх абласцях недахоп у кваліфікаваных педагагічных кадрах таксама быў вялікім. Кадравы недахоп у сельскай мясцовасці ў заходніх абласцях быў настолькі адчувальным, што некаторыя з іх у 1945 – 1946 гг., напрыклад, паўднёва-заходнія раёны Маладзечанскай вобласці, былі выдзелены ў першую групу забеспячэння па штатах, зарплаце, літаратуры [11, ар. 8]. Нават у 1947/48 навучальным годзе у в. Баравікі Іўеўскага раёна Маладзечанскай вобласці 40 дзяцей (да вайны 19 чалавек наведвалі школу) 10 – 16 гадоў не вучыліся ў школе па прычыне недахопу настаўніцкіх кадраў [11, с. 42, ар. 78]. Адзначым, што на замацаванне кваліфікаваных кадраў у заходніх абласцях БССР быў накіраваны Загад Міністэрства асветы БССР № 24 ад 20 кастрычніка 1946 года, які ва ўсходніх абласцях дазваляў перамену месца работы па асабістых заявах настаўнікаў, а ў заходніх – толькі ў выключных выпадках (па ўважлівых прычынах). Без дазволу ўпраўлення кадраў Міністэрства асветы БССР забараняўся выезд настаўнікаў за межы рэспублікі, а таксама звальненне і перавод з адной школы ў другую тых настаўнікаў 8 – 10 класаў, якія мелі закончаную вышэйшую адукацыю [5, с. 7, ар. 22].

Як адзначаюць архіўныя дакументы, пад пастаянным і дастаткова жорсткім кантролем улады знаходзіўся якасны склад пасляваеннага настаўніцтва. Вось прыклад: па стану на 1 студзеня 1947 года педагагічныя кадры Маладзечанскай вобласці былі падзелены наступным чынам: з 2558 настаўнікаў, якія працавалі ў школах, 1472 знаходзіліся ў гады вайны на акупіраванай немцамі тэрыторыі, 255 працавалі ў нямецкіх школах, праходзілі нямецкія курсы 169 чалавек, 475 закончылі польскія навучальныя ўстановы; з іх 1714 мелі няпоўную сярэднюю адукацыю, 140 сярэднюю [2, с. 22, ар. 9]. Ужо ў 1944 годзе міністрам асветы быў выдадзены загад аб звальненні з працы настаўнікаў, якія ў час акупацыі займалі кіруючыя пасады, а тых, хто працаваў у школе прымусова, прапаноўвалася перавесці ў іншыя раёны рэспублікі, бо яны не маглі «карыстацца аўтарытэтам» [2, ар. 101]. Пасля Вялікай Айчыннай вайны дзяржава не давярала грамадзянам, у тым ліку сельскім настаўнікам, якія, хоць і не па сваёй віне, апынуліся на акупіраванай немцамі тэрыторыі.

Патрэбна адзначыць, што значная частка настаўнікаў пасляваеннай беларускай школы не мела не толькі педагагічнай, але і сярэдняй, і нават няпоўнай сярэдняй адукацыі. Адноўленыя ў 1944 – 1945 гг. педагагічныя вучылішчы, настаўніцкія і педагагічныя інстытуты не здолелі ў поўнай меры вырашыць задачу падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Загадам СНК БССР № 401 ад 15 ліпеня 1944 года былі адкрыты завочныя аддзяленні пры педагагічных і настаўніцкіх інстытутах, з дапамогай якіх усе настаўнікі, якія не мелі неабходнай педагагічнай адукацыі, павінны былі закончыць завочныя педагагічныя навучальныя ўстановы [2, с. 3, ар. 31]. Праўда, у першыя пасляваенныя гады асноўная ўвага ўдзялялася стварэнню шырокай сеткі кароткатэрміновых педагагічных курсаў.

Патрэбна адзначыць, што адмоўны ўплыў на падрыхтоўку настаўніцкіх кадраў аказала ўвядзенне ў дзеянне Загада Народнага Камісара асветы ад 14 сакавіка 1945 года, згодна з якім была ўстаноўлена плата за навучанне як студэнтам вузаў і педвучылішчаў, так і вучням 8 – 10 класаў сярэдніх школ. Аднак настаўнікам-завочнікам, якія здавальняюча займаліся на завочных аддзяленнях, было ўведзена бясплатнае навучанне, аплочваўся праезд да месца вучобы за лік сродкаў, асігнаваных на завочнае навучанне [5, с. 8, ар. 107]. Нягледзячы на прымаемыя дзяржавай меры, большасць вясковых настаўнікаў заставалася не ахопленай завочным навучаннем – перашкаджалі розныя прычыны: занятасць на рабоце, двухзменныя заняткі ў школе, складанасці з вучэбнай літаратурай і г.д. Улічваючы наяўнасць магчымасцей атрымання ў рэспубліцы педагагічнай адукацыі, Міністэрства асветы загадала з першага верасня 1946 года звальняць з працы настаўнікаў, якія не мелі належнай адукацыі і не жадалі павышаць свой узровень праз завочную форму навучання [5, с. 7, ар. 30].

Як сведчаць архіўныя дакументы, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе былі пэўныя праблемы з працаўладкаваннем маладых спецыялістаў. З аднаго боку, некаторыя студэнты-выпускнікі па заканчэнні навучальнай установы ўладкоўваліся не па спецыяльнасці і недаязджалі да месца працы, якое было ўказана ў накіраванні, асабліва ў сельскую мясцовасць. З другога, значная частка настаўнікаў, напрыклад, у 1945 годзе ў Мінскай вобласці працавала не па спецыяльнасці, а многія працуючыя настаўнікі ў школах г. Мінска мелі невялікую нагрузку [5, с. 7, ар. 105]. Гэтыя працэсы мелі месца не толькі ў канцы 40-х, але і ў пачатку 50-х гадоў, таму Загад № 56 Міністэрства асветы БССР ад 1946 года абавязваў усіх дырэктараў педагагічных, настаўніцкіх інстытутаў і вучылішчаў выдаваць на рукі студэнтам-выпускнікам па заканчэнні навучальнай установы толькі накіраванне Міністэрства асветы БССР. Дыпломы аб заканчэнні навучальнай установы загадвалася выдаваць па прадастаўленні даведкі з месца работы з указаннем, што студэнт-выпускнік працуе згодна накіравання Міністэрства асветы [5, с. 7, ар. 26].

Аналіз дакументаў сведчыць, што даволі часта кіраўнікі райана мала цікавіліся фактычным працаўладкаваннем маладых спецыялістаў, не праяўлялі ўвагі да рашэння іх бытавых і сацыяльных праблем. Менавіта такія адносіны сталі прычынай таго, што значная колькасць маладых спецыялістаў, накіраваных на працу ў 1946 годзе ў Пінскую, Брэсцкую, Маладзечанскую і шэраг іншых абласцей, не была

працаўладкавана. У 1945/46 навучальным годзе, напрыклад, у Гродзенскай вобласці з 951 маладога спецыяліста ўладкавалі на працу толькі 600, «астатнія з'ехалі ў невядомым накірунку» [2, с. 22, ар. 10].

Намі ўстаноўлена, што ў вясковых школах назіралася частая змена педагагічных кадраў, што адмоўна ўплывала на якасць вучэбнага працэсу. Пры гэтым перастаноўкі і перамяшчэнні сельскіх настаўнікаў з школы ў школу не заўсёды былі матываванымі. У Маладзечанскай, Бабруйскай і іншых абласцях на працягу 1948 года звальнялі і перамяшчалі настаўнікаў з раёна ў раён, з адной школы ў другую без усялякіх тлумачэнняў. Настаўнікі ішлі ў летні адпачынак і не ведалі, дзе будуць працаваць у новым навучальным годзе [5, с. 42, ар. 177].

Вельмі цяжкая праца сельскага настаўніка, складаныя матэрыяльныя ўмовы выклікалі звальненне з педагагічнай работы і ўладкаванне на працу ў іншыя арганізацыі. Праўда, органы адукацыі імкнуліся прыцягнуць да працы ў школах тых настаўнікаў, якія працавалі не па спецыяльнасці. Такую справу зрабіў, напрыклад, Гомельскі аблана ў 1946 годзе, аднак з 270 чалавек перайшлі працаваць педагогамі толькі 60 чалавек [2, с. 130, ар. 8].

Каб палепшыць матэрыяльнае становішча настаўнікаў, ЦК КП(б)Б і Саўнаркам БССР прынялі пастанову, згодна з якой настаўнікі павінны былі атрымоўваць на аднога чалавека: цукар – 0,6 кг, чай – 0,025 кг, соль – 1,2 кг, мыла гаспадарчае – 0,4 кг, мыла туалетнае – 1 кусок, запалкі – 9 пачак, газа – 2 літры [2, с. 7, ар. 1]. У раённыя аддзелы народнай адукацыі часта падаваліся скаргі ад настаўнікаў аб парушэнні забеспячэння не толькі гэтымі прадуктамі і рэчамі, але і хлебнымі вырабамі па норме. У Палескай, Магілёўскай, Гродзенскай, Мінскай і іншых абласцях БССР хлеб адпускаўся вясковым настаўнікам з вялікім спазненнем, і пры гэтым ніжэй нормы альбо выдаваўся зернем [2, с. 23, ар. 59]. Такім было становішча і з прамтаварамі, якія часта недаходзілі да вясковых настаўнікаў. Перашкаджалі ўмацаванню дабрабыту вясковай інтэлігенцыі і высокія цэны на тавары, што дастаўляліся ў сельскія магазіны. Пры гэтым аблспажыўсаюзы ўстанаўлівалі пэўныя нормы для продажу тавараў. Настаўнікі скардзіліся на нізкую якасць тавараў, падмену дабраякасных тавараў менш якаснымі, танных рэчаў больш дарагімі. Адмоўную ролю адыграла пастанова, згодна якой вясковая інтэлігенцыя магла набыць сабе тавараў толькі на 400 рублёў [5, с. 4, ар. 184].

Дзяржавай прымаліся пэўныя захады для паляпшэння жыллёвых умоў вясковых настаўнікаў. Ім павінны былі выдзяляцца бясплатныя кватэры, паліва з разліку 7 м$^3$ дроў у год на кватэру, 3 літры газы, зніжаліся камунальныя паслугі. Аднак пры аналізе выканання пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР «О мерах по бытовому устройству учителей» было зафіксавана шмат парушэнняў. У дакуменце прыведзены такі факт: па стану на 2 лютага 1948 года ў Віцебскай вобласці замест надзялення настаўнікаў сельскай мясцовасці бясплатнымі кватэрамі выплочваліся грошы ў памеры 20 – 30 рублёў у месяц, у той час калі фактычны кошт за арэнду кватэры складаў 100 – 150 рублёў [5, с. 42, ар. 167]. Адзначым, што і гэтыя грошы сельсаветамі затрымліваліся на некалькі месяцаў.

Прааналізаваўшы архіўныя дакументы, можна зрабіць выснову, што ў першыя пасляваенныя гады вырашыць пытанне з засяленнем сям'і настаўніка ў вёсцы было проста немагчыма – тэмпы будаўніцтва новых дамоў былі маруднымі, а вяскоўцы доўга жылі ў зямлянках ці ў прыстасаваных будынках. У заходніх абласцях БССР практыкавалася перадача пад кватэры настаўнікам дамоў грамадзян, якія выехалі ў Польшчу. У Ашмянскім раёне Маладзечанскай вобласці, напрыклад, у 1945 – 1946 гг. было перададзена аддзелу народнай адукацыі 10 такіх дамоў [2, с. 122, ар. 341].

Такім чынам, фактычна ўлады праяўлялі пэўныя клопаты аб паляпшэнні жыццядзейнасці вясковага настаўніцтва, але рэальная аддача ад іх была вельмі нізкай. Як і ў выпадку з Пастановай № 245 ад 10 лютага 1943 года і Пастановай СМ СССР і ЦК ВКП(б)Б ад 10 лютага 1948 года № 245 «О повышении заработной платы и пенсии учителям начальных, семилетних и средних школ», згодна з якімі Міністэрства асветы павінна было павысіць зарплату ўсім настаўнікам. Яно і павысіла, але не намнога. Як адзначаецца ў Загадзе Мінскага абласнога аддзела народнай адукацыі ад 26 лютага 1946 года, заработная плата настаўнікам павінна была выплочвацца на вёсцы 20 чысла кожнага месяца, а ў горадзе – 16 і 1 штомесяц за палову месяца [10; ар. 35]. Намі ж устаноўлена, што грошы для вясковых настаўнікаў затрымлівалася на некалькі месяцаў і ў значна пазнейшыя гады.

У выніку невыканання мясцовымі ўладамі пастаноў і загадаў СНК БССР і Міністэрства адукацыі аб забеспячэнні вясковых настаўнікаў прадуктамі харчавання, многія з іх траплялі «ў кабалу да кулацкай часткі вёскі». У архіўных дакументах фігуруюць такія факты, калі настаўнікі вымушаны былі з-за дрэнных матэрыяльных умоў працаваць у дамашняй гаспадарцы бацькоў вучняў і заможных сялян [2, с. 8, ар. 322].

Шмат якіх недахопаў можна было б пазбегнуць, калі б праца з настаўніцтвам вёскі, нават у цяжкія гады, вялася паслядоўна і сістэмна. Тым не менш увага дзяржавы садзейнічала павышэнню аўтарытэта настаўнікаў і іх ролі ў пасляваенным аднаўленні беларускай вёскі. 12 лютага 1948 года быў выдадзены Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, якім шмат настаўнікаў БССР за бездакорную працу былі ўзнагароджаны за сваю працу ардэнамі і медалямі СССР [2, с. 41, ар. 97].

Вельмі часта настаўнік у вёсцы з'яўляўся адзінай адукаванай асобай, якой маглі даручаць выкананне важных партыйных і савецкіх дырэктыў. У выніку атрымлівалася, што вясковы настаўнік быў вымушаны ўдзельнічаць ва ўсіх дзяржаўных мерапрыемствах – ад ліквідацыі непісьменнасці да збору падаткаў. Зыходзячы з такога разумення ролі настаўнікаў у жыцці пасляваеннай беларускай вёскі, улады патрабавалі ад іх павышэння палітычнай падрыхтаванасці праз вывучэнне гісторыі ВКП(б) і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аднак такіх гурткоў было няшмат, таму асноўная маса настаўнікаў вывучала пытанні бягучай палітыкі на пасяджэннях сельскіх метадычных аб'яднанняў настаўнікаў, у вячэрніх раённых партыйных школах, палітшколах сельскага актыву, хатах-чытальнях. Безумоўна, узровень палітычнай падрыхтоўкі сельскіх настаўнікаў жадаў быць лепшым.

Адной з асаблівасцей у развіцці пасляваеннай вясковай адукацыі была праца з пераросткамі-дзецьмі, якія перайшлі адпаведны школьны ўзрост і якіх патрэбна было пасадзіць за школьную парту. Загад № 152 Народнага камісара асветы БССР «Аб парадку залічэння ў школы ўсенавуча вучняў, навучаўшыхся ў школах у перыяд акупацыі», выдадзены ў жніўні 1944 года, абавязваў залічваць вучняў 1 – 3 класаў школ, створаных у час нямецкай акупацыі, у клас вышэй, а школьнікаў 4 – 7 класаў залічваць на клас ніжэй. Вучняў, якія закончылі ў 1941 годзе адпаведныя класы савецкай школы і якія не вучыліся ў перыяд акупацыі, патрэбна было залічваць на аснове дакументаў у вышэйшыя класы. Дзяцей школьнага ўзросту, якія займаліся самастойна, трэба было навучаць у 1 – 3 класах адпаведна іх фактычных ведаў, установленых настаўнікамі і адміністрацыяй школы на працягу першай чвэрці навучальнага года [12, ар. 69].

Вывучаныя намі дакументы сведчаць, што ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў сельскай мясцовасці выяўленне дзяцей 7 – 15-гадовага ўзросту з мэтай ахопу ўсеагульным навучаннем праходзіла складана. Паўсямесна праводзіўся падворны абход настаўнікамі вёсак, праводзілася зверка дзяцей па гаспадарчых кнігах сельсаветаў. Як сведчаць справаздачы загадчыкаў райана, гэтыя зверкі рабіліся некалькі разоў у год, бо наяўнасць дзяцей школьнага ўзросту ў вёсцы на працягу навучальнага года мянялася. Шмат дзяцей 1926 – 1928 гадоў нараджэння былі вывезены ў Германію, памерлі і загінулі ў час блакад партызанскіх зон і г.д. Вялікая колькасць дзяцей ад'язджала з бацькамі ў іншыя рэгіёны БССР, саюзныя рэспублікі, у Польшчу і іншыя краіны, а тыя, хто прыехаў у Беларусь, у сельсаветах рэгістраваліся не заўсёды [10, с. 9, ар. 5]. Шмат непаразуменняў было з узростам дзяцей, бо праверыць ці ўдакладніць яго часта было проста немагчыма: у мэтах атрымання пенсіі, памяншэння сельскагаспадарчага налогу і інш., бацькі наўмысна заніжалі месяц і год нараджэння дзіцяці. Як адзначаюць архіўныя дакументы, справаздачы органаў народнай адукацыі і Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення (ЦСУ) аб колькасці дзяцей у рэспубліцы не супадалі. Напрыклад, у 1951/52 навучальным годзе па падліках Гомельскага аблана колькасць неахопленых школай дзяцей ад 7 – 15 гадоў складала 1376 чалавек, а па дадзеных ЦСУ – 14860 чалавек [13, ар. 28]. Нягледзячы на высокія тэмпы будаўніцтва новых школ, у рэспубліцы доўгі час не ўдавалася вырашыць праблему навучання ўсіх дзяцей школьнага ўзросту і рэалізаваць патрабаванні аб усеагульным пачатковым навучанні. У 1944 – 1945 гг. на вызваленай тэрыторыі БССР было ўлічана 1 250 925 дзяцей, а вучылася 1 167 911 чалавек ці 88 % [2,с. 22, ар. 96]. Толькі ў 6 раёнах рэспублікі на пачатак 1954 года навучаннем былі ахоплены ўсе дзеці [1, с. 324, ар. 447].

Патрэбна адзначыць, што адміністрацыям сельскіх школ прыцягнуць усіх дзяцей вучыцца было дастаткова складана, бо цяжкае матэрыяльнае становішча сям'і (не было адзення і абутку, не хапала прадуктаў харчавання) не дазваляла падлеткам наведваць школу. Для больш актыўнай работы былі створаны абласныя камісіі, на якія ўскладаўся кантроль за выкананнем закона аб усенавучы, за стварэннем абласных, раённых і школьных фондаў усенавуча для аказання дзецям-сіротам і дзецям інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны матэрыяльнай дапамогі вопраткай, абуткам, прадуктамі харчавання, падручнікамі, пісьмовымі прыладамі [5, с. 4, ар. 218]. У 1945/46 навучальным годзе, напрыклад, толькі з ахопленых школай дзяцей выбыла на працягу вучэбнага года ў БССР звыш 108 тыс. чалавек. Асабліва вялікі адсеў меўся ў Віцебскай вобласці (на працягу вучэбнага года выбыла 19126 чалавек). У Магілеўскай, Полацкай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай, Маладзечанскай выбыла адпаведна 12561, 10112, 9512, 9497, 9467, 8975 чалавек [5, с. 4, ар. 213]. Адзначым, што замест наведвання школы падлеткі часта адпраўляліся на заробкі грошай. Аналіз архіўных дакументаў сведчыць, што ў пасляваенныя гады дзіцячая праца часцей выкарыстоўвалася больш заможнымі сем'ямі, асабліва ў заходніх абласцях, куды на заробкі прыязджалі сяляне з усходніх абласцей БССР. Напрыклад, у Відзаўскім раёне Полацкай вобласці значная частка дзяцей не наведвала школу, таму што іх бацькі былі звязаны дагаворамі з прыватнымі асобамі па выпасу іх жывёлы [9, с. 50, ар. 86]. Устаноўлена, што па гэтай прычыне не наведвалі школу ў 1946/47 навучальным годзе 1204 чалавек у Маладзечанскай, 513 – у Баранавіцкай, 1110 – у Гродзенскай абласцях [1, с. 52, ар. 242]. З мэтай папярэджання новага адсеву ў вясковых школах стваралiся фонды ўсенавуча, куды збіраліся сродкі ад продажу прадуктаў харчавання з прышкольных участкаў, платных вечароў мастацкай самадзейнасці, перадаваліся адзенне і абутак па лініі таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца.

З другога боку, у калгасах пасля вайны адчуваўся вялікі недахоп у рабочай сіле. Як падаюць дакументы, значная частка не ахопленых вучобай дзяцей і падлеткаў працавала ў калгасах рэспублікі (у 1946/47 навучальным годзе такіх было 2500 чалавек) [2, с. 52, ар. 242]. Галоўная прычына такой з'явы хутчэй за ўсё заключалася ў тым, што не было зладжанасці ў рабоце школ і кіраўніцтваў калгасаў, якія прымалі дзяцей школьнага ўзросту на працу. Можна меркаваць, што ў вёсцы таго часу для працы ў калгасе набыццё пачатковай адукацыі лічылася дастатковым, а вучоба на сельскагаспадарчых курсах, курсах механізатараў, трактарыстаў і г.д. за некалькі месяцаў давала і спецыяльнасць, і была магчымасцю пракарміць сям'ю.

Увядзенне абавязковай сямігадовай адукацыі ў 1949/50 навучальным годзе сведчыць, што колькасць вучняў, якія працягвалі вучобу, была нязначнай. Гэтая праблема заставалася і ў 50-я гады. Напрыклад, у 1954/55 навучальным годзе сямігадовым навучаннем не было ахоплена 16520 навучэнцаў, у тым ліку ў сельскай мясцовасці 15718 вучняў [2, с. 218, ар. 10]. Для вясковых дзяцей складана было атрымаць сярэднюю адукацыю, бо толькі невялікая частка вучняў 8 – 10 класаў агульнаадукацыйнай школы магла навучацца платна. За навучанне не плацілі дзеці настаўнікаў і ваеннаслужачых, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны [5, с. 8, ар. 261].

Вайна выклікала масавае ўдоўства і безбацькоўства, што, безумоўна, паўплывала на выхаванне маладога вясковага пакалення. Па прычыне занятасці ўвесь дзень ў калгасе на сельскагаспадарчых работах, бацькі не маглі ўдзяляць патрэбнай увагі сваім дзецям і лічылі, што выхаваннем іх дзяцей павінна займацца сельскае настаўніцтва і школа. «Оставшаяся одна мать не уследит за ребёнком, поэтому ответственность за воспитание ребёнка больше всего ложится на школу», – такая выснова прагучала на адным з пасяджэнняў настаўнікаў [10, с. 1, ар. 58]. Такім чынам, на школу клалася і выхаваўчая функцыя: задзейнічаць дзяцей у розных відах пазакласнай і пазашкольнай работы.

Добрай дапамогай дзецям было прыняцце Саветам Народных Камісараў БССР Пастановы ад 18 студзеня 1946 года за № 2180 аб выдзяленні бясплатных сняданкаў для вучняў школ раёнаў, пацярпеўшых ад нямецкіх акупантаў. Канкрэтныя абрысы пастанова прыняла ў рашэннях мясцовых улад. Выканкам Віцебскага аблсавета дэпутатаў працоўных, напрыклад, 6 сакавіка 1946 года абавязваў мясцовыя выканкамы размеркаваць 26820 бясплатных сняданкаў [14, с. 3, ар. 151], выканкам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных вырашыў з 1 сакавіка 1946 года да канца навучальнага года ўвесці гарачыя сняданкі для школьнікаў у колькасці 13820 чалавек [10, с. 9, ар. 11].

Улічваючы цяжкае эканамічнае становішча насельніцтва рэспублікі ў пасляваенныя гады, Савет Міністраў БССР Пастановай № 89 ад 3 лютага 1947 года абавязваў арганізоўваць гарачыя снеданні для дзяцей загінуўшых воінаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і школьнікаў асобных раёнаў БССР, якія пацярпелі ад засухі. Згодна пастанове, норма на 1 чалавека складала 100 грамаў хлеба, 10 грамаў цукру, 20 грамаў мяса, 25 грамаў канцэнтратаў [2, с. 119, ар. 30]. Дзеля справядлівасці адзначым, што пастанова гэта выконвалася галоўным чынам у гарадах, ды і то не заўсёды.

З архіўных матэрыялаў бачна, што паспяховасць вучняў у сельскіх школах была вельмі нізкай. Па выніках работы першай чвэрці 1945/46 навучальнага года ў школах БССР 50 % вучняў былі непаспяваючымі [5, с. 16, ар. 1]. На канец 1945/46 навучальнага года з 1 206 363 вучняў у тых жа класах было пакінута на другі год 156143, ці амаль кожны восьмы, атрымалі заданне на восень 92893 чалавек. Асабліва нізкай была паспяховасць па беларускай і рускай мовах – станоўчыя адзнакі мелі каля 20 % школьнікаў [5, с. 4, ар. 231].

Даволі складанай праблемай у адраджэнні пасляваеннай вёскі было навучанне сельскай моладзі, якая ў выніку вайны не змагла атрымаць адукацыю і па свайму ўзросту не падыходзіла да навучання ў агульнаадукацыйнай школе. З мэтай здзяйснення гэтага пытання былі выдадзены пастановы СНК СССР за № 329 ад 6 ліпеня 1944 года аб стварэнні школ сельскай моладзі і СНК БССР ад 4 верасня 1944 года аб арганізацыі школ рабочай і сельскай моладзі [2, ар. 53].

У пасляваеннае дзесяцігоддзе вячэрнія школы сельскай моладзі былі двух тыпаў: пачатковыя (1 – 4 класы) і сямігадовыя (1 – 7 класы). Яны пачыналі свой навучальны год з 1 лістапада. Адзначаныя школы ў сельскай мясцовасці ствараліся пры наяўнасці не менш 15 чалавек у бліжэйшых да дадзенай школы вёсак, а там, дзе колькасць жадаючых вучыцца была невялікай (4 – 5 чалавек), адкрываліся класы сельскай моладзі. Дзяржава прадугледзела бясплатнае навучанне ва ўсіх тыпах школ сельскай моладзі і абавязвала мясцовыя арганізацыі забяспечваць рабочых-навучэнцаў дадаткова зверх нормаў 100 грамамі хлеба, 30 грамамі крупы, 20 грамамі цукру ў дзень [15, ар. 10].

Архіўныя дакументы сведчаць, што ў першыя гады існавання школ сельскай моладзі назіраўся вялікі адсеў вучняў па прычынах працяглых камандзіровак, працы ў вячэрнія гадзіны, аддаленасці школы ад месцажыхарства і працы, прызыва ў Савецкую Армію, непадрыхтаванасці школ сельскай моладзі да работы (не было асвятлення, паліва, не хапала настаўнікаў, не завозіліся падручнікі) і г.д. Напрыклад, у пачатку 1946/47 навучальнага года ў Магілёўскай вобласці працавала 39 школ сельскай моладзі з 2002 навучэнцамі, а ў канцы – 27 школ з 954 навучэнцамі [16, ар. 15]. Не аказала значнай

дапамогі ў наладжванні справы рашэнне Савета Міністраў БССР аб забароне выкарыстання вучняў на работах, звязаных з адрывам ад вытворчасці. Прычына была адна – старшыні сельсаветаў і калгасаў патрабавалі ад калгаснікаў у першую чаргу выканання сельскагаспадарчых планаў. Напрыклад, старшыня калгаса «Новы мір» проста забараніў 14 вучням наведваць Мішкаўскую школу сельскай моладзі Ульскага раёна Віцебскай вобласці, а старшыня калгаса імя Дзяржынскага гэтага ж раёна звольніў 24 вучняў з працы [5, с. 1, ар. 432].

Пры такіх адносінах мясцовага кіраўніцтва дзяржаўны план адкрыцця ў сельскай мясцовасці школ для моладзі штогод зрываўся. Па сведчаннях загадчыкаў школ сельскай моладзі, было цяжка прыцягнуць моладзь да вучобы, таму прымалі ўсіх, хто прыходзіў, часта без дакументаў аб адукацыі, без папярэдніх іспытаў, нават без заяў. У выніку такога прыёму многія вучні 6 класа ў некаторых раёнах траплялі ў 9 – 10 класы. Намі ўстаноўлена, што ў школы сельскай моладзі пераходзілі на вучобу дзеці-другагоднікі і тыя, хто меў нездавальняючыя адзнакі ў агульнаадукацыйных школах, а таксама падлеткі 14 – 15 гадоў [5, с. 18, ар. 47].

Трэба адзначыць, што школы сельскай моладзі дрэнна забяспечваліся падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, пісьмовымі прыладамі працы; дзейнічаў астатковы прынцып – ім выдзялялі тое, што заставалася пасля забеспячэння агульнаадукацыйных школ. Такім чынам, у школах адсутнічалі бібліятэкі, не хапала газы для правядзення заняткаў у вячэрні час, у некаторых школах не было лямпаў. Фінансаванне школ сельскай моладзі было яшчэ больш няўстойлівым. Ёсць прыклады, калі на адну школу на ўвесь навучальны год выдзялялася не больш 1000 рублёў, што з'яўлялася вельмі недастатковым [5, с. 14, ар. 246]. Адзначаныя цяжкасці і недахопы адмоўна сказаліся на імкненні сельскай моладзі атрымаць адукацыю.

Патрабавала ўмяшальніцтва ўлад і становішча з дарослай граматнасцю, хаця раённыя аддзелы народнай адукацыі вялі ўлік неадукаванай моладзі з першых месяцаў пасля вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аднак прызыўныя камісіі райваенкаматаў пастаянна адзначалі вялікую колькасць малаадукаваных юнакоў сярод прызыўной моладзі. На наш погляд, адбывалася гэта таму, што сам улік неадукаваных людзей вёўся бессістэмна і патрабаваў неадкладнага паляпшэння. Адны аддзелы адукацыі, напрыклад, улічвалі няграматных і малаграматных людзей ва ўзросце да 40 гадоў, другія – з 14 да 15 гадоў і г.д.

Няведанне рэальнага становішча ў раёнах прыводзіла да разыходжанняў лічбаў у наяўнасці неадукаванага сельскага насельніцтва. Такія факты былі выяўлены ў 1948 годзе ў Вілейскім, Крывіцкім, Маладзечанскім раёнах Маладзечанскай вобласці [5, с. 42, ар. 87]. У Псуйскай і Замхаўскай пачатковых школах Пліскага раёна, Варанкоўскай сямігадовай і Сасноўскай пачатковай школах Шаркаўшчынскага раёна Полацкай вобласці навучанне дарослых не вялося зусім, бо не быў праведзены ўлік непісьменнага насельніцтва [5, с. 3, ар. 161].

Прааналізаваўшы архіўныя матэрыялы, можна зрабіць выснову, што навучалася грамаце намнога менш, чым было ўлічана. Возьмем у якасці прыкладу Гродзенскую вобласць. Тут на канец 1946 года было 16466 непісьменных, малапісьменных – 22320 чалавек, а навучалася ў групах граматы адпаведна 1782 (9,6 %) і 3718 (16,6 %) чалавек [2, с. 18, ар. 54].

План адкрыцця школ і груп грамат у пасляваенныя гады штогод не выконваўся. Навучанне дарослых вялося на нізкім метадычным узроўні, навучэнцы дрэнна засвойвалі праграмны матэрыял. Школы і групы граматы ў сельскай мясцовасці вельмі дрэнна забяспечваліся падручнікамі і пісьмовымі прыладамі працы. Аб фармальным падыходзе да дзяржаўнай справы навучання дарослага насельніцтва ў сельскай мясцовасці сведчыць наступны факт. Выканкам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных прыняў 11 чэрвеня 1951 года рашэнне, а абласны аддзел народнай адукацыі выдаў Загад ад 28 ліпеня 1951 года № 185 аб завяршэнні ліквідацыі непісьменнага і малапісьменнага насельніцтва па Гродзенскай вобласці, хаця па дадзеных абласнога статыстычнага ўпраўлення на пачатак гэтага ж 1951 года ў вобласці налічвалася яшчэ 22 тыс. неадукаваных людзей [2, с 75, ар. 151].

Нельга не адзначыць, што старэйшае пакаленне было вельмі цяжка прыцягнуць да навучання – у сельскай мясцовасці было шмат работы як у калгасах, так і ў асабістых гаспадарках. Часта ў архіўных дакументах падаюцца выказванні дарослага насельніцтва, што навучанне – гэта справа для маладога пакалення. Усё разам узятае не дазволіла органам адукацыі ў вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін (да 1 красавіка 1952 года) ажыццявіць поўнае навучанне грамаце дарослага насельніцтва.

Падагульнючы, можна адзначыць, што культурнаму аднаўленню беларускай вёскі садзейнічалі, па-першае, дзяржаўныя асігнаванні і ініцыятыўнае будаўніцтва школ сіламі калгаснікаў; па-другое, меры, якія прымаліся дзяржавай па падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў, іх матэрыяльнай падтрымцы; па-трэцяе, развіццё беларуска- і рускамоўных школ; па-чацвёртае, развіццё ўсеагульнага навучання дзяцей і падлеткаў, у тым ліку ў школах сельскай моладзі; нарэшце, па-пятае, ліквідацыя непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва.

Аднак цяжкі пасляваенны час, масавыя разбурэнні ў беларускай вёсцы і недастатковае фінансаванне стрымлівалі матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне вясковых агульнаадукацыйных школ. На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя вострай заставалася праблема наяўнасці прафесійных педагагічных кадраў, якая мела спецыфіку на захадзе і ўсходзе БССР. Патрабавалі пэўнай увагі дзеці-пераросткі, моладзь, дарослае няграматнае насельніцтва пры правядзенні вучэбнага працэсу ў вёсцы. Дадатковыя складанасці для культурна-аднаўленчай дзейнасці пасляваеннага настаўніцтва, асабліва ў заходніх абласцях Беларусі, выклікала дзейнасць антысавецкіх узброеных польскіх (Арміі Краёвай), украінскіх (бандэраўскіх), літоўскіх («Лясныя браты»), беларускіх нацыяналістычных фарміраванняў. У 1947 годзе толькі ў заходніх абласцях БССР налічвалася каля 40 такіх бандфарміраванняў. Яны праводзілі варожую Савецкай дзяржаве палітыку, агітавалі насельніцтва, каб яно не адпраўляла сваіх дзяцей у беларускія школы, пасылалі актывістам лісты з пагрозамі, забівалі настаўнікаў і савецкіх работнікаў, знішчалі школьнае абсталяванне і будынкі. Прыклады такой дзейнасці зафіксаваны амаль у кожным раёне Гродзенскай, Пінскай, Полацкай, Маладзечанскай, Брэсцкай абласцей [5, ар. 105]. Менавіта па гэтай прычыне ў заходніх абласцях узнікалі цяжкасці з выкананнем закона аб усенавучы, перапісам дзяцей школьнага ўзросту, працаўладкаваннем настаўнікаў і г.д.

Тым не менш аднаўленчыя працэсы набіралі моц і беззваротны характар, напаўняючы агульнаадукацыйную вясковую школу новым зместам і новымі формамі работы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). Ф. 4, воп. 17, с. 21.
2. НА РБ. Ф. 42, воп. 4, с. 5.
3. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898 – 1986). Т. 7. 1938 – 1945. – 9-е изд., доп. и испр. – М.: Политиздат, 1985. – 574 с.
4. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДА МВ). Ф. 322, воп. 3, с. 8.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДА ВВ). Ф. 2797, воп. 1, с. 83.
6. ДА ВВ. Ф. 2797, воп. 2, с. 3.
7. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДА МгВ). Ф. 124, воп. 2, с. 40.
8. ДА МВ. Ф. 1553, воп. 1, с. 19.
9. Занальны дзяржаўны архіў г. Глыбокае (ЗД АГ). Ф. 141, воп. 1, с. 82.
10. ДА МВ. Ф. 1243, воп. 1, с. 10.
11. ДА МВ. Ф. 4629, воп. 3, с. 3.
12. ДА МВ. Ф. 222, воп. 3, с. 3.
13. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДА ГВ). Ф. 1044, воп. 2, с. 26.
14. ДА ВВ. Ф. 1, воп. 3, с. 28.
15. ЗД АГ. Ф. 535, воп. 1, с. 3.
16. ДА МгВ. Ф. 124, воп. 4, с. 2.